Адзначаныя задачы павінны быць асновай наказу сябрам Сялянскіх Таварыстваў Узаемадапамогі па справаздачным дакладам іх Камітэтаў, у часе перавыбарчай кампаніі, якая пачнецца з 1-га сьнежня г. г. і прадоўжыцца па 1-е студзеня 1928 г.

НА МЯСЦОХ

І. Мялешка

Організацыя цэхавых ячэек сябе апраўдала

(Фабрыка „Чырвоная Зорка“, мяст. Чашнікі)

Пры значным росьце фабрычнай ячэйкі ня было магчымасьці своечасова даць партыйныя абавязкі ўсім партыйцам, галоўным чынам ня было магчымасьці праверыць выкананьне гэтых абавязкаў, маючы на ўвазе, што ячэйка павінна была займацца пытаньнямі гаспадарчага, прафэсыянальнага і савецкага характару. Ячэйка задалася мэтай вывучэньня пытаньня аб магчымасьці організацыі цэхавых ячэек. У выніку вывучаньня гэтага пытаньня, выявілася, што організацыя 2-х цэхавых ячэек на нашай фабрыцы магчыма, мэтазгодна і неабходна. Райком таксама гэта мерапрыемства адобрыў і у траўні месяцы ўжо былі організаваны **мэханічная і вытворчая цэхавыя ячэйкі.**

У сучасны момант праведзены перавыбары Бюро цэхавых ячэек **і ўжо можна зрабіць вынікі аб іх працы.**

У часе перавыбараў бюро колектыву выдзеліла камісію для абсьледваньня працы цэхавых ячэек, былі заслуханы даклады цэхавых ячэек на бюро колектыву. Справаздачныя даклады ячэек прайшлі актыўна. У спрэчках па дакладам партыйцы адзначылі акрамя недахопаў і дасягненьні, што ячэйкі поўнасьцю перайшлі стадыю свайго організацыйнага афармленьня і падышлі да вырашэньня пытаньня свайго цэху. Указаньні цэхавыя ячэйкі ад бюро колектыву атрымлівалі у штодзённай таварыскай гутарцы, без усялякіх пісьмовых абежнікаў. Пры складаньні агульнага пляну працы бюро колектыву адначасова даваўся орыентыроўны плян галоўных пытаньняў, якія адносяцца да працы цэхавых ячэек. Цэхавая ячэйка брала у аснову сваіго пляну больш галоўныя пытаньні, прапанаваныя бюро колектыву, складала свой плян-каляндар, уключала туды па сваёй ініцыятыве дадатковыя пытаньні і потым свой плян-каляндар давала на зацьверджаньне Бюро колектыву.

Калі прыглядзецца да пытаньняў, якімі займаліся цэхавыя ячэйкі, то мы убачым наступнае: ужо на другім, пасьля організацыі ячэйкі, сходзе былі пастаўлены даклады аб партдысцыпліне, разьмеркаваньні абавязкаў сярод сяброў ячэйкі, заслуханьне дакладаў аб працы цэх. бюро вытворчых нарад (кіраўнікамі якіх зьяўляюцца комуністы), заслуханьне дакладаў комсамольскай цэхавай ячэйкі. За справаздачны пэрыод ячэйкі патрапілі заслухаць даклады амаль што ўсіх партыйцаў аб выкананьні партабавязкаў і гэтым самым прымусілі адсталых партыйцаў падцягнуцца у выкананьні сваіх партабавязкаў. На ячэйкавых сходах прапрацованы пытаньні аб уцягненьні ў партыю рабочых ад варштата і кваліфікаваных рабочых. На агульных сходах цэхавых ячэек ставіліся даклады аб удзеле партыйцаў у вытворчых нарадах. Цэхавыя ячэйкі ў летні час займаліся прапрацоўкай пытаньняў пастаноў XV парт-

конфэрэнцыі, пастанову сакавіковага Пленуму ЦК КП(б)Б і жніўеньскага Пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) і—яшчэ шэрагу пытаньняў.

Падводзячы вынікі працы цэхавых ячэек, Бюро колектыву канстатавала, што мэта арганізацыі цэхавых ячэек сябе апраўдывае. За апошні час у вытворчасьці сярод беспартыйных адчуваецца аўтарытэт ячэйкі. Ячэйка арганізацыйна патрапіла наладзіць працу, была плянавасьць у працы,—абгаварваліся пытаньні, якія адбіваюць жыцьцё цэха, павялічылася дысцыплінаванасьць сярод партыйцаў, ячэйкі дабіліся ліквідацыі завінавачанасьці па сяброўскім узносам і г. д.

У сучасны момант арганізавана 3-ця цэхавая ячэйка.

Арганізацыя цэхавых ячэек дала магчымасьць у большай ступені ахапіць партыйным уплывам беспартыйную масу, уцягнуць у практычна-нізавую кіруючую працу частку партыйцаў (як, напрыклад, Бюро ячэйкі), павялічыўся ўдзел партыйцаў у вытворчым жыцьці прадпрыемства, больш аддаецца ўвагі пытаньням профпрацы.

Але неабходна адзначыць, што у працы цэхавых ячэек ёсьць і недахопы.

Яшчэ няма як з боку бюро ячэек, так і паасобных партыйцаў, адпаведнай ініцыятывы. У галіне масавай працы ў паасобных партыйцаў таксама няма ініцыятывы. У гэтых адносінах цэхавыя ячэйкі павінны і могуць многае зрабіць, бо яны знаходзяцца бліжэй да партыйцаў працуючых у вытворчасьці. У бліжэйшы час цэхавым ячэйкам прыйдзецца больш увагі аддаць гаспадарчым пытаньням прадпрыемства.

Цэхавыя ячэйкі і кіруючы імі партколектыў павінны атрымліваць пэрыодычна ўказаньні аб палепшаньні працы і г. д. Да гэтага часу, напрыклад, партколектыў фабрыкі „Чырвоная Зорка" ніякіх указаньняў не атрымліваў. Пастановай ЦК УсеКП(б) аб масавай працы на вытворчасьці звернута асаблівая ўвага на працу цэхавых ячэек. У пункце 3-ім пастановы, напрыклад, гаворыцца:

„Партыйныя камітэты павінны аддаць сур'ёзную ўвагу, асабліва на буйных прадпрыемствах, пастаноўцы працы цэхавых ячэек"

Неабходна больш высьвятляць у друку вопыты працы цэхавых ячэек, дзе яны існуюць, а таксама павінна больш аддавацца ўвагі з боку Райкомаў і Акругкомаў.

Н. Разумов

Вопросы партпросвещения в Залинейном районе

(Гомель, Залинейный район)

Обстановка, в которой проходила в текущем учебном году организация партпросвещения, ставила перед партийными комитетами, парт и комсомольскими ячейками чрезвычайно большие и сложные задачи. Во-первых, необходимо было мобилизовать все силы для того чтобы, не ослабляя темпа всех областей нашей хозяйственной, советской и другой работы, детально раз'яснить каждому члену партии, каждому комсомольцу вопросы внутри партийного положения, чтобы изучить решения по всем вопросам об'единенного пленума ЦК и ЦКК, т. к. все решения пленума охватывали все те вопросы, которые в повседневной жизни предприятий интересовали всю рабочую массу. Естественно партийная масса должна была их изучить, для того, чтобы на каждый вопрос рабочих давать точный и ясный ответ. В настоящее время мы по школьной сети закончили проработку решений пленума ЦК и ЦКК и делаем переход к программным вопросам.

Мы были поставлены перед необходимостью широкого раз'яснения принципа добровольности в отношении выбора вида партийной учебы. Подводя итог организации партийного просвещения, мы констатируем, что эта вторая задача (добровольность выбора вида учебы) недостаточно ясно усвоена частью партийной организации. Первый месяц партийной учебы дает нам не весьма отрадную картину работы низовой партийной сети: имеется чрезвычайно низкая посещаемость членами партии и комсомольцами политшкол 1-й и 2-й ступени. Особенно важно подчеркнуть то обстоятельство, что к числу слабо интересующихся вопросами партпросвещения относится та группа членов и кандидатов партии, которая не имеет партийной нагрузки. Чрезвычайно мало уделялось внимания со стороны месткомов и ячеек вопросу подбора беспартийных рабочих для посылки в политшколы. Не охвачен беспартийный рабочий актив, который должен был быть в политшколах. Для того, чтобы к переходу на программные вопросы во всей школьной сети исправить допущенные ошибки в области организационно раз'яснительной работы ячеек, нам пришлось еще раз провести совещание апоргов, на котором детально проработали вопрос о партпросвещении и наметили ряд конкретных мероприятий.

Школьная партсеть

К настоящему моменту по всему Залинейному району функционирует 5 групп вечпартшколы с охватом 174 чел. В политшколах 1-й и 2-й ступени охвачено 383 чел. и в ЦВРШ занимается 57 ч.; таким образом, охвачено всеми видами школьного партпросвещения 42,1% всей партийной организации. Мы считаем, что в условиях нашего района, когда у значительной части парторганизации, оставшейся вне партийной

учебы, еще не имеется навыков к самообразовательной работе, данный процент охвата партийной организации школьной сетью чрезмерно низок. Поэтому всем партийным ячейкам придется, наряду с проведением в жизнь директив Р-ма в области усиления внимания к вопросу нормального посещения уже записавшихся в школы т. т., еще раз'яснить товарищам, могущим заниматься в низовой партсети и направить их для занятий.

Особо важное значение мы придаем вопросу постановки индивидуального образования, т. к. значительная часть членов партии связана с раз'ездной и сменной работой на предприятиях. Для обслуживания т. т., связанных со сменной работой, нам представилась возможность организовать только 2 сменных политшколы 1-й и 2-й ступени. Создать же параллельно дневные группы ВПШ и других видов партпросвещения не представляется возможным. На совещании апоорганизаторов дана установка как необходимо организовать руководство и всю работу с индивидуалами. В первую очередь партячейкам необходимо учесть политический уровень каждого товарища, записавшегося индивидуалом. На основе его политподготовки и выбора вида учебы надо указывать индивидуалам повседневное содействие как в смысле обеспечения учебными пособиями, методическими указаниями, созданием соответствующей обстановки для их работы в красных уголках, клубах и т. д.

Необходимо, чтобы партийные ячейки взяли на себя полную ответственность за ведение учета работы индивидуалов, а также установить периодическую проверку выполнения заданий индивидуалами. К тем ячейкам, где большая часть партийной массы связана с раз'ездами, необходимо по линии АПО Р-ма прикрепить пропагандистов для обслуживания индивидуалов.

Политучеба коммунистов, живущих в деревне

Вопрос о повышении политического уровня рабочих коммунистов, живущих в деревне, занимает в нашей работе большое место, т. к. рядом фактов доказано, что, благодаря отсталости в политическом отношении в отдельных селениях, члены партии не проводят в жизнь директив партии и мало проявляют себя в общественной жизни деревни. Наряду с организацией политучебы среди коммунистов, живущих в деревнях, необходимо по линии ячеек проводить с ними периодические совещания по вопросам текущей политики партии, политических компаний и т. д. Необходимо также учитывать работу каждого партийца, живущего в деревне. Надо помогать им вести борьбу со всякими болезненными явлениями в деревне, которые иногда отражаются и на рабочих, связанных с деревней. Рабочих, живущих в деревнях в Залинейном районе, имеется большая прослойка, поэтому нам необходимо принять все меры к тому, чтобы среди них широко развернуть массовую работу по линии профсоюзов, партийных и комсомольских ячеек. Для охвата парт., живущих в дер., организовано 2 политшколы II ступени и идет развертывание индивидуальных заданий.

Белоруссизация по линии партпросвещения

На основе решений партийных органов и идя навстречу желанию партийной массы, мы ввели преподавание белорусского языка, как предмет в ВПШ и политшколах 2-й ступени. В некоторых сокращенных политшколах, ввиду большого желания слушателей, введено также преподавание белорусского языка. Для партактива района, неохваченного школьной сетью, организуются курсы.

Кадр пропагандистов

Повышение политического роста всей партийной ор-ции, количественное расширение и повышение политуровня ячейкового актива ставит перед нами и Окружкомом со всей остротой вопрос - повышения квалификации руководящего кадра пропагандистов. В условиях нашего района в текущем учебном году нет абсолютно никаких улучшений. Часть высоко квалифицированных пропагандистов (руководители совпартшколы) выбыли из организации, и мы очутились перед фактом снижения качества работы пропагандистских кадров. На этой почве уже в начале учебного года имеются недовольства со стороны партийцев. Имеющийся небольшой кадр пропагандистов целиком связан с основной работой в учреждениях или на производстве и естественно не имеет времени соответствующим образом подготавливаться к занятиям. Ввиду отсутствия квалифицированных сил для организации методической работы с пропагандистами района и эта сторона дела также заставляет желать лучшего. Перед нами во всей широте стоит вопрос о создании нового рабочего кадра агитаторов пропагандистов. Необходимо всем партячейкам с серьезнейшим вниманием отнестись к вопросу подбора т. т. в группу агитаторов пропагандистов, работа которых будет организована при ВПШ.

Политсамообразование

Весь партийный актив, записавшийся в кружки самообразования, в настоящее время заканчивает проработку вопросов об'единенного пленума ЦК и ЦКК. По ячейкам проводится организационная работа оформления кружков, раз'ясняется система и установка самообразовательной работы на текущий год. Развертывание политсамообразования связано с большими трудностями, во-первых, потому, что нет достаточного количества консультантов рецензентов, во-вторых, срыв самообразования в прошлом году создал неблагоприятную обстановку для данной работы. Отсутствие программ и учебных пособий по отдельным дисциплинам также мешает развертыванию самообразовательной работы.

Б. Шпітальнік

Праца сельпартячэек

(Мазырская акруга)

За апошнія часы (паўтары-два гады) сельпартячэйкі значна ўзрасьлі і ўзмацнілі сваю дзейнасьць, ахапіўшы сваім кіраўніцтвам асноўныя галіны працы у вёсцы (кіраўніцтва працай сельсаветау, коопэрацыі, камітэтаў узаемадапамогі, працы з беднатой і г. д.). гэтым самым значна паднялі свой аўтарытэт і аўтарытэт партыі наогул сярод шырокіх масаў працоўнага сялянства. У сучасны момант амаль што ня сустрэнеш выпадку, калі тая ці іншая партыйная ячэйка у вёсцы, пры якіх-бы та ня было умовах працавала б без пляну. Такіх выпадкау амаль што няма.

Пытаньне гаспадарчага будаўніцтва, адно з важнейшых пытаньняў партыйнай працы знайшло у выстарчальнай меры свае практычнае праламленьне у працы сельпартячэек. Лозунг партыі — „Гаспадарчая праца асяродак усей працы“, у выстарчальнай меры увайшоу у агульную працу партыйных ячэяк, разгортваньнем у шэрагу сельсаветаў будаунічай працы (пабудоўка памяшканьняу пад школы, рамонт шляхоу, мастоу, арганізацыя мэліорацыйных таварыствау і г. д.). Так, напрыклад, па ініцыятыве Танескай ячэйкі Тураускага раёну было арганізавана мэліорацыйнае таварыства, якім (таварыствам) праведзена работа на 800 дзесяцінах балота, у выніку чаго сяляне у гэтым годзе накасілі больш 300 вазоў сена.

Карпавіцкая ячэйка аддавала значную увагу працы свайго коопэратыву і у выніку атрымалася павялічэньне паявога капіталу на 106%, павялічэньне сярэдняга пая на аднаго пайшчыка на 82,7%, павялічэньне ліку пайшчыкаў на 12,8%. Гэтая ж ячэйка аддала значную ўвагу пытаньню работы з беднатою. Арганізавана група беднаты пры сельсавеце, якая праводзіць сталую работу праведзена 8 сходау беднаты, коопэравана 183 бядняцкія гаспадаркі.

Такія прыклады маюцца і ў працы іншых ячэек, якія бязумоўна гаворыць аб тым, што значная частка партыйных ячэек у вёсцы сталі на пэўны шлях, навучыліся і ў асноўным правільна праводзяць сваю працу.

Прыходзіцца, аднак, усё-ж адзначыць слабасьць працы часткі ячэек у гэтым напрамку, асабліва па лініі калектывізацыі сельскай гаспадаркі, большага унядрэньня культурных пачынаньняу у с.-г. і г. д. Так, напрыклад: Капцэвіцкай сельячэйкаю, Петрыкоўскага раёну на 14 праведзеных сходах разгледжана толькі адно гаспадарчае пытаньне. Ячэйка амаль што зусім не займалася абгаварваньнем пытаньняу зьніжэньня цэн коопэрацыі, прыцягненьня сродкау насельніцтва укладнымі апэрацыямі, ажыўленьня дзейнасьці крамнай камісіі і г. д. Запясоцкая ячэйка, Тураўскага раёну пры правядзеньні земляўпарадкаваньня ніякай ініцыятывы з свайго боку не праявіла і ў выніку гэтага заможная частка вескі мела свой уплыў на бядняцкія масы, цераз каго і выяўляла свае настроі.

У росьце сельпартячэек маюцца наступныя дасягненьні.

	[illegible]	[illegible]	Лік партыйцаў	Колькасьць [illegible]
У 1925 г. .	25	—	158	—
У 1926 г. .	32	7	499	341
У 1927 г. .	52	20	761	262

Такім чынам з прыведзеных лічбаў відаць, што як сетка самых партыйных ячэек, так і колькасьць партыйцаў у іх паступова павялічваецца.

Значнае месца ў працы сельпартячэек займала пытаньне працы з беднатою. Калі яшчэ нядаўна, які-небудзь год таму назад, некаторыя райкомы працу сярод беднаты праводзілі самі, не давяралі ячэйкам праводзіць яе, дык у сучасны момант такіх выпадкаў ужо няма. Праца сярод беднаты ўсё далей пераходзіць ад выпадковасьці да сыстэмы і плянавасьці. Адсутнічаюць таксама моманты непаразуменьня кіраўнічым складам партячэек і большай часткаю парторганізацыі формаў і мэтадаў працы сярод беднаты. Такіх выпадкаў, як недапушчэньне сераднякоў на сходы, пазбаўленьне іх права голасу амаль што няма.

Наколькі ячэйкі у практычнай працы праламалі гэтую задачу гаворыць наступныя даныя: 16 ячэйкамі у працягу году прапрацована 57 пытаньняў працы з беднатою, арганізавана па акрузе да 85 груп беднаты, якія значна разгарнулі сваю працу. Калі у мінулым як на сходах, так і на групах беднаты пераважная большасьць падала на кампанейскія і палітычныя пытаньні, дык у сучасны момант практычныя пытаньні займаюць адно з асноўных месц (па даным 65 груп беднаты гаспадарчыя пытаньні займаюць 42,3 %, на агульных сходах беднаты 34 %). Значна ўзмацнілася гаспадарчая дапамога беднаце.

Усё гэта (узмацненьне дзейнасьці ячэек, значны абхоп сваім кіраўніцтвам асноўных галін працы) значна падняло аўтарытэт партыйных ячэек і усей партыі сярод шырокіх масаў сялянства, што у значнай ступені сьцьвярджаецца наступнымі данымі: у апошняй кампаніі перавыбараў сельсаветаў (26-27 г.) колькасьць партыйцаў у складзе апошніх павялічылася на 2,67 %, у спажывецкай кооперацыі (у праўленьнях) на 7 %.

Вынікам узмацненьня працы сельпартячэек зьяўляюцца, бязумоўна, прынятыя мерапрыемствы з боку акруговага камітэту і райкомаў КПБ па больш частаму інструктаваньню і абсьледваньню працы партыйных ячэек (за 27 г. было 47 выездаў па розным пытаньням працаўнікоў акругкому ў сельячэйкі райкомамі, апрача плянавых выездаў у ячэйкі, праводзяцца сыстэматычныя нарады сэкратароў ячэек і г. д.; правядзеньню месячных курсаў сэкратароў сельпартячэек, сельжанарганізатараў і ўзмацненьне вёскі партпрацаўнікамі (за 27 г. акругкомам накіравана для працы ў вёсцы 135 партыйцаў).

Слабым месцам у працы сельячэек дагэтуль зьяуляецца масавая праца. Хоць у гэтым напрамку і маюцца некаторыя дасягненьні па лініі правядзеньня адкрытых сходаў, лепшага падбору пытаньняў да сходаў, таксама і лепшай падрыхтоўкі гэтых пытаньняў (у сярэднім адкрытыя сходы складаюць 67,18 %) большага прыцягненьня беспартыйных на гэтыя сходы (у сярэднім наведваемасьць партсходаў беспартыйнымі складае 25 чалав., з іх стала наведваючых у сярэднім 13 чал. на ячэйку), пастаноўкі больш практычных пытаньняў мясцовага характару і выклікаць гэтым самым большай актыўнасьці з боку як партыйцаў, так і

беспартыйных, але ў большасьці ячэек гэтая праца пастаўлена яшчэ слаба. Ёсьць выпадкі, калі некаторыя ячэйкі замыкаюцца ў сваім вузкім коле праводзячы пераважна закрытыя сходы а калі і праводзяцца адкрытыя сходы, дык ставяцца на іх агульныя пытаньні (аб міжнародным становішчы і г. д.) пры зусім нязначнай пастаноўцы практычных пытаньняў. Назіраліся выпадкі, калі некаторыя ячэйкі пры пастаноўцы практычных пытаньняў, спрачак па ім не адкрывалі, што бязумоўна гаворыць аб боязьні крытыкі з боку беспартыйных.

Вынікам такой працы зьяўляецца слабая наведваемасьць партсходаў беспартыйнымі. Так, напрыклад, Брынеўскай ячэйкай Петрыкоўскага раёну з праведзеных 7 сходаў, толькі 2 былі адкрытыя, а таму наведваемасьць гэтых сходаў з боку беспартыйных складаецца толькі з 3-х чалавек.

Недахопам масавай працы зьяўляецца таксама слабасьць працы з беспартыйным актывам. Беспартыйны сялянскі актыў за апошнія часы значна ўзрос колькасна і палепшыўся якасна, аб тым гавораць наступныя даныя—

Склад сельскіх саветаў:

Гады	Усяго абрана	Па соцыяльнаму становішчу				
		парабкоў	бедзякоў	серадзякоў	служачых	іншых
1925 г. . .	1494 100%	12 0,8%	267 18%	1010 67,4%	98 6,3%	107 8%
1926 г. . .	1619 100%	27 1,7%	520 30%	868 54%	84 5%	120 7%

Такія, прыблізна, даныя маюцца і ў праўленьнях спажывецкай сельска-гаспадарчай коопэрацыі, камісіях пры сельсаветах і г. д.

Праца ж з беспартыйным актывам, за выключэньнем нязначнай часткі ячэек, якія праводзяць час ад часу нарады актыву, амаль што ніякая не праводзіцца. Некаторымі ячэйкамі нават не праводзіцца вучот гэтаму актыву, ужо не гаворачы аб іншай якой працы.

Акругкомам КПБ была зьвернута сур'ёзная ўвага на ўзмацненьне масавай працы на вёсцы, паставіўшы гэтае пытаньне неаднакроць як на пленумах, так і на пасяджэньнях бюро. Ажыўленьне гэтай галіны работы зьяўляецца неадкладнай задачаю райкомаў і ячэек КПБ на бліжэйшы пэрыяд.

У ЦКК—НК РСІ

Аб пляне работ ЦКК—НК РСІ на 1927-1928 г.

У аснову пляну работ на 1927-1928 г. пакладзены тыя самыя плянавыя прадпасылкі т. Орджонікідзе, якія ляглі ў аснову перабудовы пляну мінулага году.

Але-ж дырэктывы Жнівеньскага Аб'яднанага Пленуму ЦК і ЦКК выклікалі неабходнасьць высунуць новыя і больш завострыць старыя задачы, —імення справу будаўніцтва, задачу па зьніжэньню будаўнічага індэксу на 15 % скарачэньне адміністрацыйна-гаспадарчых выдаткаў на 20%, сябекошт прамысловай прадукцыі, неабходнасьць найбольшага скарыстаньня ашчаднасьці ў насельніцтва на дапамогу дзяржаве, з заўвагай, што „праверка выкананьня застаецца самым слабым зьвяном у працы дзяржаўнае машыны"; усе гэтыя моманты былі падлічаны пры пабудове пляну. Да гэтага далучаюцца яшчэ тыя абставіны, што БССР пераважна краіна сялянская і пытаньні вёскі павінны заняць значнае мейсца ў нашай працы.

У параўнаньні з мінулым годам, калі было толькі 35 тэм, новы плян пабудован амаль што на 100% больш. Трэба аднак прыняць пад увагу тое, што плян 26-27 году ня быў дасканальны у асобных яго частках, напр.: заданьне Кантрольнага Аддзелу лічылася пад адной тэмай „праверка выкананьня дырэктыў", у гэтым-жа годзе гэты разьдзел налічвае 11 тэм.

Аднак, трэба падкрэсьліць, што плян гэтага году напружан і патрабуецца максымум энэргіі, жорсткі рэжым эканоміі для яго выкананьня.

У справе палепшаньня дзяржаўнага апарату побач з праверкай ходу рэарганізацыі апарату і вывучэньня вопыту па перабудове яго на функцыянальнай сыстэме, будуць працягнуты работы па спрашчэньню раённага апарату і вышэйшых зьвеньняў, якія ў мінулым годзе дужа пасьпешна вывучаліся (як праходжаньне спраў у ЦВК, СНК, Плянавай Камісіі). Такім чынам вышэйшы і ніжэйшы паверхі займуць увагу РСІ. Побач з гэтым ставіцца праца таксама і па рацыяналізацыі ўстаноў. Сыстэма фінансавага кантролю і пастаноўка самакантролю ўнутры ўстаноў—будзе асаблівай задачай наступнага году. Барацьба з бюрократызмам, кумаўством і цяганінаю будзе мець посьпех тады, калі да нашай працы па скарачэньню апарату прыдзе на дапамогу актыўнасьць мас праз Саветы. Вось чаму пытаньне „савецкая дэмократыя" высунута ў пляне, як асобная тэма.

У справе спрашчэньня гаспадарчага апарату ў плян уведзен мінімум тэм, якія часткова ўжо кончаюцца вывучэньнем (Цэнтрасьпірт, Скурсындыкат і інш.), часткова будуць вывучацца.

У прамысловасьці, побач з капітальным будаўніцтвам (Бабруйскі камбінат, Асінстрой і інш.) высоўваюцца такія заданьні, як дрэваапрацовачная прамысловасьць і сельска гаспадарчая машынабудоўля, акрамя льняной і шклянай прамысловасьці цэнтральных заданьняў.

Задача па зьніжэньню сабекошту прадукцыі прымусіла некалькі зьнізіць папенную плату прыбыткі ад лесу зьніжаюцца і таму больш трэба накіраваць увагі на апрацоўку дрэва і тым павялічыць прыбыткі дзяржавы, каб падтрымаць роўнавагу нашага бюджэту.

Калі пагледзець на кожную тэму пляну, дык можна ўпэўніцца, што намечаны самыя вострыя пытаньні.

Якія партпраблемы будуць вывучацца ЦКК у 1927-1928 г

Прэзыдыум ЦКК зацьвердзіў наступны плян работ па вывучэньню партпраблем і партправерачных работ.

У першую чаргу ідуць тэмы *па праверцы дырэктыў партыі:*

Праверка выкананьня дырэктыў партыі па нацпалітыцы: праверка выкананьня партдырэктыў аб рабоце сав ячэек па барацьбе з бюрократызмам (праверка выкананьня прапаноў абсьледваньня ЦКК 1927 г.), праверка выкананьня ЛКСМБ пастаноў сакавіковага Пленуму ЦК КП(б)Б; праверка выкананьня дырэктыў абсьледваньня ЦКК аб унутрыпартыйнай дэмократыі, абсьледваньне Камвузаў і Саўпартшкол пад пунктам гледжаньня праверкі якасьці падрыхтоўкі партыйных кадраў, праверка дырэктыў партыі па пытаньню аб замежных камандыроўках

У галіне *барацьбы з бюракратызмам маюцца* такія пытаньні—дзейнасьць судова-сьледчых органаў па барацьбе з бюракратызмам і валакітай, праверка хуткасьці праходжаньня ў судова-сьледчых органах спраў, якія ўзбуджаюцца органамі КК-РСІ, праверка хуткасьці праходжаньня і рэагаваньня на скаргі рабочых і сялян у органах РСІ, Пракуратуры і Выканкомаў.

У галіне барацьбы з хваробнымі зьявішчамі намячаецца абсьледваньне дзейнасьці ячэек і Райкому па папярэджаньню і барацьбе з хваравітымі зьявішчамі сярод камуністых.

У галіне *рэгуляваньня росту* партыі намечана адно заданьне дынаміка росту (прыём і убылі (выключэньні, выхады) арганізацый КП(б) Беларусі і выкананьне партдырэктыў у галіне рэгуляваньня росту партыі.

З пытаньняў *сувязі з масамі*—праверка выкананьня дырэктыў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб прыцягненьні мас і грамадзкіх арганізацыяў да зьніжэньня цэн і барацьбы з недахопамі апарату каапэрацыі, праверка рэагаваньня установамі і арганізацыямі на рабселькораўскія заметкі.

Акрамя гэтагу будуць праводзіцца *арганізацыйныя работы:*

праверка выкананьня дырэктыў ЦКК аб сувязі АКК з ЛКСМ і аб рабоце Канфліктных Камісіяў ЛКСМБ; вывучэньне прыцягваемасьці камуністых да судовай адказнасьці; вывучэньне выхадаў з партыі сыстэма сувязі органаў КК РСІ з масамі і меры прыцягненьня да масавай работы КК партактыву, аб падыходзе да членаў партыі—сялянам ад сахі (па матар'ялах АКК), аб далейшых мерапрыемствах па палепшаньню работы Сэкцыяў РСІ пры Гарсаветах, вывучэньне хваравітых зьявішч у арганізацыі (па матар'ялах АКК і ПК ЦКК.

Аб прадзьездаўскіх дакладах ЦКК

У зьвязку з прадзьездаўскай справаздачнаю кампаніяй, ЦКК намечаны і праводзяцца даклады на наступных канфэрэнцыях:

На ўсіх акруговых партканфэрэнцыях 8 дакладаў,
на раённых канфэрэнцыях . 9 „
Менская акр. арганізацыя у Барысаўскім, Кастрычнікаускім раёне.
Гомельская арганізацыя— у Рэчыцкім і Цэрахоўскім раёне.
Бабруйская **акр. арганізацыя—Рагачоў, Жлобін.**
Магілеўская **акр. арганізацыя—Шклоў.**

Воршынская акр. арганізацыя—Горкі.
Мазырская акр. арганізацыя—Калінкавічы.

Акрамя пералічаных дакладаў Партколегіяй ЦКК робяцца даклады на 17 ячэйковых сходах у зьвязку з перавыбарамі партзасядацеляў.

Усяго ў прадзьездаўскай кампаніі б. дак. зроблена членамі ЦКК 35 дакладаў, адказнымі працаўнікамі НК РСІ 2 даклады аб працы РСІ на раённых канфэрэнцыях.

Больш бюджэтнай дысцыпліны

Прэзыдыум ЦКК заслухаў даклад Грашовага Кантролю НКГС адносна выкананьня дырэктыў аб бюджэтнай дысцыпліне і рэжыме эканоміі па бюджэтным установам.

Адзначна, што ў мінулым бюджэтным годзе ўстановамі, якія знаходзяцца на дзяржбюджэце, былі праведзены выдаткі сродкаў па бюджэту без выстарчальнага ўвучоту рэжыму эканоміі. Тлумачыцца гэтае тым, што кантроль праходзіў без уцягненьня грамадзкіх арганізацый у справу барацьбы за рэжым эканоміі.

Невыстарачальна праведзен кантроль па пытаньню суровага правядзеньня бюджэтнай дысцыпліны.

Прэзыдыум ЦКК пастанавіў:

Прапанаваць Граш. кантролю скласьці сьпіс установаў, якія не праводзяць суровага рэжыму эканоміі і бюджэтнай дысцыпліны і прадставіць на разгляд Сакратарыяту ЦКК.

Граш. кантролю зьвязацца з АКК у сэнсе адпаведнага рэагаваньня на акруговыя установы, якія парушаюць правядзеньне рэжыму эканоміі і бюджэтнай дысцыпліны.

Прапанаваць усім АКК заслухаць даклады адпаведных акруговых установаў па выкананьню дырэктыў аб бюджэтнай дысцыпліне.

Прыняць больш рашучыя крокі адносна установаў, якія ня прытрымліваюцца бюджэтнай дысцыпліны і парушаюць дырэктывы партыі і ўлады ў галіне рэжыму эканоміі.

Правесьці фактычны кантроль, як праводзіцца 20 проц. зьніжэньне адміністрацыйна-гаспадарчых выдаткаў.

Катэгарычна забараніць усім установам непрадугледжаныя бюджэтныя сумы выдаткоўваць не па прызначэньню, а ўносіць у прыбытак рэспублікі.

Зьвярнуць увагу Грашовага Кіраўніцтва на праверку выдаткаваньня ўстановамі іх фондаў.

Аб несвоечасовай выплаце пэнсіі

ЦКК заслухала інфармацыю Нар. Кам. Юстыцыі аб праходжаньні судовых спраў прыцягваемых да судовай адказнасьці за нявыплату пэнсіі, згодна дырэктывы ЦК КП(б)Б.

ЦКК абавязала Пракурору Рэспублікі прыняць катэгарычныя крокі да забесьпячэньня выкананьня дырэктывы ЦК па данаму пытаньню.

Прапанована Пракурору Рэспублікі прадставіць у 5-ці дзённы тэрмін дакладную запіску аб праходжаньні паказаных вышэй спраў у судовасьледчых органах.

Аб 20 зьніжэньні адміністрацыйна-гаспадарчых выдаткаў

ЦКК рашыла зьвярнуцца з лістам ад імя ЦК, СНК і ЦКК да партарганізацыяў і кіраўнікоў прадпрыемстваў і ўстановаў аб мабілізацыі грамадзкай увагі вакол задачы зьніжэньня адміністрацыйна-гаспадарчых выдаткаў на 20% (шляхам пастаноўкі дакладаў на актыве, у ячэйках, на сходах рабочых і служачых і інш. мерапрыемствы).

АФІЦЫЙНАЯ ЧАСТКА

РЭЗАЛЮЦЫЯ

Сакратарыяту ЦК КПБ ад 10/X—27 г. аб асноўных дырэктывах пры перавыбарах спажывецкай і сельска-гаспадарчай коопэрацыі

Адзначаючы, што справаздачна-перавыбарная кампанія, як спажывецкай, так і сельска-гаспадарчай коопэрацыі, зьяўляецца найбольш адказным пэрыядам у разьвіцьці і працы коопэрорганізацыі і што гэта кампанія дае магчымасьць прыцягнуць шырокія колы рабочых і сялянства, асабліва яго беднейшай часткі, да актыўнага ўдзелу ў абгаварэньні штодзённай практычнай працы кожнага коопэратыву, да шырокай крытыкі маючыхся ў рабоце коопэрацыі недахопаў і разам з тым спрыяе павялічэньню коопэрацыйнай грамадзкасьці і выяўленьню лепшага актыву, які можна скарыстаць на практычнай працы ў коопэрацыі—лічыць неабходным:

1. Надаць кампаніі шырокі масавы характар, для чаго ў парадку падрыхтоўкі перавыбараў ставіць даклад аб працы асобных коопэратываў на сходах беднаты, пленумах сельсаветаў, на жаночых дэлегацкіх сходах і інш. Фракцыі саюзу с.-г. і лясных рабочых павесьці падрыхтоўчую працу сярод рабочых саўхозаў з тым, каб яны прынялі актыўны ўдзел у справаздачна-перавыбарнай кампаніі коопэрацыі.

У гарадох, поплеч з абгаварэньнем дакладаў Рабкопаў на рабочых сходах і на сходах жанчын-дэлегатак, ставіць гэткія даклады і на агульных сходах рэдкалегій насьценных газэт.

2. Перад агульнымі сходамі ўпаўнаважаных-пайшчыкаў, таксама неабходна склікаць сходы беднякоў-упаўнаважаных, дзе абгаварыць справаздачы праўленьняў коопэратываў, вызначыць разьмеркаваньне прыбыткаў і склад новых праўленьняў і рэвізыйных камісій з тым, каб рашэньні сходу беднякоў-упаўнаважаных вынесьці на агульныя сходы ўпаўнаважаных і там іх дружна правесьці.

3. Праверыць скарыстаньне фонду па коопэрыраваньню беднаты, выявіць яе актыўны ўдзел у працы коопэрорганізацый і адначасова ў кампанію перавыбараў скарыстаць яе ў мэтах яшчэ большага коопэрыраваньня насельніцтва, асабліва яго беднейшай часткі, у мэтах праверкі шырокімі масамі пайшчыкаў работы сваіх коопэратываў, асабліва ў галіне зьніжэньня цэн, скарачэньня выдаткаў, пастаноўкі гандлёвай, крэдытнай і грамадзка-організацыйнай працы.

4. У час перавыбарчай кампаніі праверыць кіруючы склад коопэрорганізацый, замацаваць на сталай працы і ў далейшым апраўдаўшых сябе працаўнікоў, выявіць новых актывістых рабочых і сялян, асабліва беднякоў і жанчын з тым, каб яшчэ больш умацаваць склад праўленьняў і рэвізыйных камісій коопорганізацый, а таксама палепшыць і актывізаваць склад упаўнаважаных, склад лавачных камісій і культкамісій.

5. Выходзячы з таго, што разьмер уласных сродкаў коопарганізацый нязначны ў параўнаньні з іх зваротамі, што адмоўна адбіваецца на грашовым становішчы коопарганізацый, у час перавыбараў правесьці павялічэньне разьмераў устаўных, паявых і спэцыяльных капіталаў па сельска-гаспадарчай крэдытнай сыстэме і дабіцца павялічэньня паступленьня паявых капіталаў па ўсім сыстэмам коопэрацыі.

6. У мэтах далейшага і больш поўнага коопэраваньня вясковай беднаты выдзяліць на гэтую мэту 10 проц. з чыстых прыбыткаў па ўсёй коопэратыўнай сетцы, пры чым падрыхтоўчую працу па коопэраваньню беднаты пачаць у час самых перавыбараў.

7. Акругкомам і Райкомам КПБ у мэтах узмацненьня партуплыву і парткіраўніцтва перавыбарамі коопэрацыі, абгаварыць на сваіх пасяджэньнях, а таксама і на сходах партячэек даклады аб працы коопорганізацый, а таксама разглядзець падрыхтоўчую працу да перавыбараў і зацьвердзіць іх пляны, пры чым, ставячы асноўнай задачай узмацненьне парткіраўніцтва, аднак не дапушчаць мэтадаў камандваньня і непатрэбнага рэжыму, асабліва пры складаньні выбарных органаў коопэрацыі.

8. Даручыць Акругкомам і Райкомам КПБ, а таксама і фракцыі цэнтральных коопэратыўных устаноў у час падрыхтоўкі і асабліва ў час самых перавыбараў весьці сталы ўчот усёй працы па перавыбарам коопэрацыі, у прыватнасьці выявіць маемасны склад пайшчыкаў, з тым, каб пасьля заканчэньня кампаніі мець мажлівасьць выявіць і падвесьці яе агульныя вынікі.

9. Аддзелу Друку даць дырэктыву рэдакцыям цэнтральных і акруговых газэт распачаць асьвятленьне на старонках друку падрыхтоўчай працы да перавыбараў коопэрацыі, а таксама і самых перавыбараў.

10. Даручыць фракцыям Белкоопсаюзу, Белсельсаюзу і Белсельбанку на падставе гэтых пастаноў распрацаваць і даслаць на месца падрабязныя інструкцыі аб справаздачна-перавыбарчай кампаніі коопэрацыі.

РЭЗАЛЮЦЫЯ

Сакратарыяту ЦК КП(б)Б ад 4/X-27 г. аб асноўных дырэктывах у перавыбарах Камітэтаў Сялянскае Ўзаемадапамогі

1. У падрыхтоўку і правядзеньне перавыбараў КСУ ўцягнуць шырокія колы сялянства, шляхам пастаноўкі масавае справаздачнасьці аб праробленай КСУ працы, актыўнай крытыкі недахопаў у ёй і вызначэньня практычных мерапрыемстваў па далейшаму замацаваньню і разьвіцьцю маламоцных сялянскіх гаспадарак і пашырэньню сялянскае ўзаемадапамогі.

2. Акругкомам і Райкомам КП(б)Б прыняць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзеньні кампаніі перавыбараў КСУ шляхам разгляду і зацьверджэньня пляну перавыбараў, выпрацоўкі прыстасаваных да мясцовых умоў практычных дырэктыў у гэтай кампаніі, выяўленьня і падбору працаздольнага складу КСУ, а таксама—непасрэдным актыўным удзелам кожнай вясковай партыйнай і комсамольскай ячэйкі ў самых перавыбарах.

3. Асаблівая ўвага ў ходзе падрыхтоўкі і перавыбараў КСУ павінна быць зьвернута на ўдзел беднаты і батрацтва ў гэтай кампаніі, для чаго неабходна папярэдняе абгаварэньне на сходах беднаты практычных пытаньняў працы КСУ, складу выбарчых органаў і інш.

4. Уцягненьне жанчын бяднячак, асабліва жанчын—кіраўнікоў гаспадарак таксама павінна павялічыцца як у падрыхтоўцы і правядзеньні кампаніі перавыбараў КСУ, так і ў кіруючым складзе апошніх, для чаго

выявіць загадзя дакладны лік сялянак беднячак, асабіста запрасіць іх на перавыбарныя сходы і лепшых з іх, пры папярэднім абгаварэньні складу КСУ, вызначыць для актыўнай працы.

Таксама лічыць неабходным уцягненьне ў кампанію перавыбараў КСУ дэлегацкіх жаночых сходаў, шляхам абгаварэньня на апошніх плянаў перавыбараў і вызначэньня чарговых задач у працы КСУ.

5. Пры перавыбарах праверыць кіраўніцтва і практычную дапамогу нізавых партыйных і савецкіх органаў у штодзённай працы КСУ асабліва па галіне правядзеньня імі асноўных арганізацыйна-гаспадарчых мерапрыемстваў (колектыўна-дабраахвотнае сяброўства, пашырэньне і праца вытворчых аб'яднаньняў, праца па коопэраваньню беднаты і іншае), а таксама праверыць пастаноўку справаздачнасьці і скарыстаньня сродкаў.

6. Прапанаваць фракцыі ЦКСТУ ўвесьці ў Гомельскай акрузе ў час перавыбарчай кампаніі организацыйную структуру сялянскіх таварыстваў Узаемадапамогі і іх камітэтаў існуючую на БССР у межах 1920, увязаўшы гэтую працу з працай па ўзбуйненьню сельсаветаў па Гомельшчыне.

7. Прапанаваць аддзелу друку і рэдакцыям цэнтральных і акруговых газэт пачаць з лістапада месяца высьвятленьне ў друку падрыхтоўкі і правядзеньня перавыбараў КСУ.

8. Даручыць фракцыі ЦК СТУ на падставе гэтае пастановы распрацаваць і даць на месцы падрабязныя практычныя ўказаньні аб падрыхтоўцы і правядзеньні перавыбараў Сельскіх Таварыстваў Узаемадапамогі.

РЭЗАЛЮЦЫЯ

Бюро ЦК КП(б)Б ад 13/X—27 г. аб прасоўваньні машын, насеньня і ўгнаеньня ў вёску

1. Канстатаваць, што па лініі сельска-гаспадарчай коопэрацыі, Цэнтраземскладу ўзрастае завоз у вёску сельска гаспадарчых прылад, машын, насеньня і ўгнаеньняў. Ня гледзячы на гэта, запатрабаваньні вёскі, за выключэньнем плугоў, поўнасьцю не забясьпечаны.

2. Адзначыць, што політыка крэдытных устаноў па лініі забясьпечаньня машынамі, мае правільную тэндэнцыю (павялічэньне доўга-тэрміновых крэдытаў і зьмяншэньне каротка-тэрміновых крэдытаў). Аднак, невыстарчальны разьмер доўга-тэрміновых і каротка-тэрміновых крэдытаў і суадносіны між імі, а таксама і тэрміны крэдытаваньня (70 проц. доўгатэрміновага крэдыту да 3-х год і 30 проц. да 5 год), неорганізаванае калектыўнае забесьпячэньне вёскі—зьявіліся прычынай невыстарчальнага забесьпячэньня машынамі і прыладамі бедняцка-серадняцкіх груп у вёсцы.

Констатаваць, што як у дзейнасьці Цэнтраземскладу, так і сельскагаспадарчай коопэрацыі, ёсьць вялікія недахопы ў справе прасоўваньня машын, прыладаў і насеньня ў вёску:

1) Невыстарчальны падлік запатрабаваньня машын, насеньня і ўгнаеньняў з боку вёскі, што зьявілася адной з прычын затаварваньня некаторымі таварамі.

2) Невыкананьне дырэктыў ЦК аб падліку і праверцы скарыстаньня як доўга-тэрміновых, так і каротка-тэрміновых крэдытаў па лініі тых, альбо іншых соцыяльных груп у вёсцы.

3) Дырэктыва X Зьезду КП(б)Б аб прасоўваньні буйных машын у бедняцка-серадняцкія пласты, шляхам організацыі машынных таварыств выконваецца вельмі слаба. У прыватнасьці, ня ўлічаны былі магчымасьці па організацыі машынных таварыств у паселішчах, якія земляўпарадкаваліся.

4) Констатаваць невыстарчальнасьць увагі з боку Цэнтраземскладу і сельска-гаспадарчай коопэрацыі да забесьпячэньня комун і арцеляй больш складаным тыпам сельска-гаспадарчых прылад.

5) Дырэктывы, дадзеныя ЦК аб прасоўваньні ў вёску прадзільных і ткацкіх варштатаў, да гэтай пары ня выкананы. Забесьпячэньне-ж льнотрапалкамі і льноцёркамі вёскі вельмі слабае.

Бюро ЦК КП(б)Б прапануе: 1) Даручыць фракцыі Наркамзему, Белсельгассаюзу і Цэнтраземскладу арганізаваць падлік запатрабаваньняў вёскі па лініі машын, насеньня і ўгнаеньняў.

2) Палепшыць пастаноўку падліку прасоўваньня машын, насеньня і ўгнаеньняў па пэўным соцыяльным групам у вёсцы.

3) Арганізаваць падлік і праверку выкарыстаньня цэлевых крэдытаў па розным соцыяльным групам у вёсцы.

4) Зьвярнуць больш увагі на арганізацыю машынных таварыств і арганізаванага прасоўваньня да бедняцка-серадняцкіх пластоў машын, прылад і ўгнаеньняў, прыдаць выключную ўвагу, асабліва разгортваючы гэту працу ў паселішчах, якія земляўпарадкаваліся. Пераглядзець існуючую сетку машынных таварыств з пункту гледжаньня соцыяльнага іх складу і ў бок большага іх узбуйненьня.

5) Узмацніць забесьпячэньне комун, арцеляў, колектыўных гаспадарак больш складаным тыпам сельска-гаспадарчых прылад.

6) Даручыць экономічнай нарадзе вырашыць пытаньне аб павялічэньні долі доўга-тэрміновых крэдытаў і павялічэньні тэрмінаў доўга-тэрміновага крэдытаваньня на машыназабясьпечаньне. Даручыць перапрацаваць пытаньне аб разьліку прамысловасьці і гандлюючых організацый, а таксама гандлюючых арганізацый з сялянствам.

7) Запрапанаваць Наркамгандлю, фракцыі Сельгассаюзу, Цэнтраземскладу і ВСНГБ безадкладна прыступіць да забясьпечаньня вёскі машынамі, якія палягчаюць працу сялянкі — ткацкімі, прадзільнымі варштатамі, льнотрапалкамі, льнацёркамі і ваўначоскамі.

8) Усе гэтыя мерапрыемствы па лініі Наркамзему, Цэнтраземскладу, сельгаскоопэрацыі, павінны павялічыць удзельную вагу ў набыцьці машын, насеньня, угнаеньняў бедняцка-серадняцкімі пластамі вёскі. Гэтай задачы павінна быць падначалена і выкарыстаньне цэлевых крэдытаў.

9) Неабходна ў далейшым ажыцьцявіць дырэктыву ЦК аб пераважным накіроўваньні машын, па меры грашовага і організацыйнага ўзмацненьня сельска-гаспадарчай коопэрацыі, праз сыстэму сельска-гаспадарчай коопэрацыі з адпаведным накіраваньнем крэдытаў, захоўваючы дзьве сыстэмы забясьпечаньня вёскі машынамі (дзяржаўную і коопэратыўную).

Зьвярнуць увагу Акругкому на неабходнасьць большай увязкі працы Цэнтраземскладу і сельска-гаспадарчай коопэрацыі па лініі прасоўваньня машын у вёску і выкарыстаньня крэдыту на машыназабясьпечаньне.

Адказны рэдактар *М. Галадзед*

Члены рэдколегіі *А. Сянькевіч*, *Рыжоў*, *Гоузман*